## Алесь Пісьмянкоў



...Не для нас гэты час, не для нас,
Мы яго нежаданыя дзеці...

### *ПАЭТІ РЫБНІЦА*

*Н. Г.*

Зноў мароз — вясёлы зух
На прасьпект абрынуўся.
Эх, каб меў бы я кажух,
Бегаў бы да рыбніцы.
  Ды сяджу — ня рыпнуся,
  Думаю пра рыбніцу.
Там і стронга, і ласось,
Россып беларыбіцы...
Новы рускі, быццам лось
Точыцца ля рыбніцы.
Не, зусім не селядца
Хочацца багатаму:
Шанец ёсьць у малайца —
Вечар іх сасватае.

Я ж сяджу — ня рыпнуся,
Верш пішу пра рыбніцу.

## *ДЫяЛОГ*

— Што, мой дружа Пегас,
Не ляціш на Парнас,
Абганяючы вецер?
— Не для нас гэты час,
Не для нас,
Мы яго нежаданыя дзеці.